# § 19. Знешнепалітычная дзейнасць Рэспублікі Беларусь

§ 19-1

§ 19-2

Якія падзеі грамадска-палітычнага жыцця Беларусі на рубяжы XX–XXI стст. зрабілі найбольшы ўплыў на геапалітычнае становішча нашай краіны?

**Прыярытэты знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь.** Пасля абвяшчэння незалежнасці Рэспубліка Беларусь выйшла на міжнародную арэну як суверэнная дзяржава, як еўрапейская краіна, якая мае глыбокія гістарычныя традыцыі дзяржаўнасці.

Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў непрымянення сілы альбо пагрозы сілай, мірнага ўрэгулявання спрэчак. Наша краіна прытрымліваецца адзіных падыходаў да развіцця адносін з усімі замежнымі партнёрамі як на Усходзе, так і на Захадзе. Беларусь выбудоўвае міжнародны дыялог на аснове прынцыпаў добрасуседства,міралюбства, роўнасці і ўзаемнай павагі, неўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў.

Прыярытэтам знешняй палітыкі Беларусі з'яўляецца палітычнае і эканамічнае супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй. Паміж дзвюма краінамі рэгулярна ажыццяўляюцца двухбаковыя кантакты на вышэйшым узроўні, а таксама на ўзроўні кіраўнікоў расійскіх суб'ектаў федэрацыі і беларускіх рэгіёнаў.

Беларусь з'яўляецца членам Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), мэта якой — развіццё супрацоўніцтва ў знешнепалітычнай, ваеннай, ваенна-тэхнічнай сферах, каардынацыя і аб'яднанне высілкаў у барацьбе з міжнародным тэрарызмам і іншымі сучаснымі пагрозамі бяспецы. Таксама нашай краіне важна ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва з народамі Украіны, Польшчы, Літвы, Латвіі. Гэта нашы гістарычныя суседзі, блізкія па менталітэце, гісторыі і нават па чалавечых, сваяцкіх сувязях, а таксама важныя партнёры ў рэгіёне, патэнцыял супрацоўніцтва з якімі далёка не вычарпаны.



Сімвал Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы

На еўрапейскім вектары знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь важным з'яўляецца ўмацаванне партнёрства з краінамі Еўрасаюза ў сферах узаемнага інтарэсу: гандлю і інвестыцый, транспарту, транзіту, трансгранічнага і рэгіянальнага супрацоўніцтва, спрашчэння візавага рэжыму, аховы навакольнага асяроддзя. Беларусь — надзейны партнёр Еўрапейскага саюза (ЕС) не толькі з пункту гледжання падтрымання сацыяльна-эканамічнай стабільнасці ў рэгіёне, але і па стратэгічна важных пы-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

таннях агульнаеўрапейскага значэння: забеспячэнні ваенна-палітычнай, энергетычнай і экалагічнай бяспекі, барацьбы са злачыннасцю, наркатрафікам, нелегальнай міграцыяй.

У XXI ст. Мінск не аднойчы станавіўся міжнароднай пляцоўкай, на якой абмяркоўваліся і прапаноўваліся шляхі вырашэння складаных сусветных і рэгіянальных праблем. Сталіца Беларусі асацыюецца ў свеце з Мінскімі пагадненнямі як міжнародна прызнанай асновай урэгулявання канфлікту ва Украіне. У 2014 г. Мінск стаў месцам правядзення пасяджэнняў Трохбаковай кантактнай групы «Украіна — Расія — АБСЕ».

*Абмяркуйце, у чым заключаюцца перавагі і недахопы геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь.*

**Дзейнасць Беларусі ў ААН.** Важным прыярытэтам знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца ўзаемадзеянне з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый. Удзел у працы ААН, сістэме яе органаў і спецыяльных устаноў дазваляе больш эфектыўна вырашаць задачы знешнепалітычнага забеспячэння працэсаў развіцця беларускай дзяржавы і мадэрнізацыі нацыянальнай эканомікі.

У 1992 г. у Мінску адкрылася прадстаўніцтва ААН. Беларусь актыўна супрацоўнічае з такімі арганізацыямі і ўстановамі сістэмы ААН, як Спецыялізаваная ўстанова Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА), Міжнародная арганізацыя працы (МАП), Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ), Упраўленне ААН па наркотыках і злачыннасці (УНЗ) і іншымі.

На ўрачыстай цырымоніі перадачы габелена беларускі мастак А. Кішчанка, узгадаўшы словы Эсхіла «Мастацтва — вочы нацыі», сказаў: «Я прывёз вам вочы маёй Беларусі. У вачах гэтых адлюстраваліся боль і надзея, мудрасць і трывога».

*Пракаменціруйце словы мастака. Растлумачце, чаму захаванне памяці аб чарнобыльскай аварыі мае міжнароднае значэнне.*



Габелен «Чарнобыль» у будынку Арганізацыі Аб'яднаных нацый. Мастак *А. Кішчанка.* 1991 г.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Наша краіна адной з першых падпісала Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, а таксама Парыжскую хартыю для новай Еўропы, што дазволіла ёй стаць паўнапраўным удзельнікам Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ). Рэспубліка Беларусь з'яўляецца членам Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР), прынята ў Міжнародны валютны фонд (МВФ).

Рэспубліка Беларусь дасягнула вялікіх поспехаў у супрацоўніцтве з еўрапейскімі краінамі па пераадоленні доўгатэрміновых наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. 8 снежня 2016 г. на пленарным пасяджэнні Генеральная Асамблея ААН прыняла ініцыяваную і падрыхтаваную дэлегацыяй Беларусі рэзалюцыю «Доўгатэрміновыя наступствы чарнобыльскай катастрофы». Важным сімвалічным элементам рэзалюцыі з'яўляецца абвяшчэнне 26 красавіка Міжнародным днём памяці аб чарнобыльскай катастрофе.

**Стварэнне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Развіццё інтэграцыі паміж Беларуссю і Расіяй.** Асноўным стратэгічным саюзнікам Рэспублікі Беларусь была і застаецца Расійская Федэрацыя. Двухбаковае партнёрства, развіццё саюзніцкіх адносін з Расіяй абумоўлены геаграфічнай і культурна-гістарычнай блізкасцю дзвюх краін і народаў, узаемадапаўняльнасцю эканомік, цеснымі кааперацыйнымі сувязямі беларускіх і расійскіх кампаній.

| Этапы развіцця ўзаемаадносін паміж Беларуссю і Расіяй |
|---|
| **1995 г.** – падпісанне Дагавора аб сяброўстве, добрасуседстве і супрацоўніцтве Беларусі і Расіі |
| **2 красавіка 1996 г.** – падпісанне Дагавора аб стварэнні Садружнасці Беларусі і Расіі |
| **2 красавіка 1997 г.** – стварэнне Саюза Беларусі і Расіі. Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі |
| **Снежань 1998 г.** – падпісанне Дагавора аб роўных правах грамадзян і Пагаднення аб стварэнні роўных умоў суб'ектам гаспадарання дзвюх краін |
| **8 снежня 1999 г.** – падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы |

Дагавор аб стварэнні **Саюзнай дзяржавы** заклаў асновы цеснай інтэграцыі нашых краін, надаў дынамічнае развіццё беларуска-расійскім адносінам пры ўмове, што і Расія, і Беларусь застаюцца самастойнымі суб'ектамі сусветнай супольнасці. Гэтым жа дакументам прадпісвалася стварэнне органаў, якія рэгулююць дзейнасць Саюзнай дзяржавы і жыццё ўнутры яе. У іх лік увайшлі Вышэйшы Дзяржаўны Савет, Савет Міністраў, Пастаянны Камітэт, Парламенцкі Сход.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Асноўны партнёр Беларусі ў праекце па будаўніцтве АЭС — расійская кампанія «Атамбудэкспарт». Агульная сума інвестыцый складае каля 10 млрд долараў. Гэта самы буйны і значны праект у Саюзнай дзяржаве і Еўропе.



Беларуская атамная электрастанцыя. 2021 г.

У рамках Саюзнай дзяржавы Беларусь і Расія эфектыўна развіваюць гандлёва-эканамічнае, інвестыцыйнае і інавацыйнае супрацоўніцтва, разнапланавыя кааперацыйныя і гуманітарныя сувязі.

Беларусь і Расія эфектыўна каардынуюць свае дзеянні на міжнароднай арэне ў адпаведнасці з Праграмай узгодненых дзеянняў у сферы знешняй палітыкі, якая прымаецца кожныя два гады.

Працэс інтэграцыі паміж Расіяй і Беларуссю працягваецца: нашы краіны заўсёды імкнуцца знаходзіць і знаходзяць рашэнні нават самых складаных пытанняў.

**Фарміраванне Еўразійскага эканамічнага саюза.** Беларусь з’яўляецца актыўным удзельнікам і іншых інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы. У 1995 г. прэзідэнтамі Расіі, Беларусі і Казахстана быў падпісаны дагавор аб стварэнні **Мытнага саюза**, да якога далучыліся Кыргызстан і Таджыкістан. З апорай на гэты саюз у 2000 г. было створана Еўразійскае эканамічнае супольніцтва (ЕўрАзЭС), а ў 2007 г. прынята рашэнне аб стварэнні адзінай мытнай тэрыторыі. З 2010 г. функцыянуе Еўразійскі мытны саюз.

З 1 студзеня 2012 г. на тэрыторыі Мытнага саюза ЕўрАзЭС пачала дзейнічаць Адзіная эканамічная прастора (АЭП), якая з’яўляецца важнай умовай стабільнага і эфектыўнага развіцця эканомік дзяржаў-удзельніц і павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва.

29 мая 2014 г. у сталіцы Казахстана быў падпісаны дагавор аб стварэнні **Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС)**, які пачаў функцыянаваць з 1 студзеня 2015 г.

*Абмяркуйце, чым была выклікана неабходнасць стварэння новых інтэграцыйных утварэнняў на постсавецкай прасторы.*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Эмблема Еўразійскага эканамічнага саюза

На постсавецкай прасторы гэтая арганізацыя з’яўляецца інтэграцыйным аб’яднаннем, якое актыўна развіваецца. Для Беларусі з яе развітой прамысловасцю ЕўрАзЭС адкрыла рынкі збыту айчыннай экспартнай прадукцыі: трактароў, грузавых аўтамабіляў, халадзільнікаў, лекавых сродкаў, мэблі і інш.

**Узаемаадносіны Беларусі з Еўрапейскім саюзам, Кітаем і іншымі краінамі свету.** Еўрапейскі саюз (ЕС) займае важнае месца ў знешняй палітыцы Беларусі. У 1992 г. Рэспубліка Беларусь атрымала статус «спецыяльна запрошанага» члена Савета Еўропы. У 1995 г. было падпісана пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве паміж Беларуссю і ЕС.

У 2009 г. Беларусь стала краінай — удзельніцай праграмы ЕС «Усходняе партнёрства».

Праведзены перамовы аб партнёрстве ў сферы мабільнасці для забеспячэння лепшага кіравання міграцыйнымі патокамі, па пагадненнях аб спрашчэнні візавага рэжыму і рэадмісіі, якія аблягчаюць працэдуры выдачы кароткатэрміновых віз, а таксама рэадмісіі нелегальных мігрантаў паміж Еўрапейскім саюзам і Беларуссю.

У 2016 г. была створана Каардынацыйная група ЕС — Беларусь. Гэтая група служыць пляцоўкай для палітычнага дыялогу па ўсім спектры тэм, пачынаючы з эканомікі і фінансаў і заканчваючы пытаннямі адукацыі і навуковых даследаванняў.

Выгаднае супрацоўніцтва наладжана з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Беларусь і Кітай неаднойчы выказвалі адзінства поглядаў па пытаннях міжнароднай палітыкі — пабудовы шматпалярнага свету, глабалізацыі, правоў чалавека. Неаднойчы абедзве дзяржавы падтрымлівалі адна адну ў ААН і іншых міжнародных структурах.

Паміж нашымі краінамі заключана каля сарака буйны́х крэдытных пагадненняў у сферы энергетыкі, будаўніцтва, транспартнай інфраструктуры, прамысловасці, сельскай гаспадаркі. Сярод іх можна вылучыць развіццё мабільнай сувязі, вытворчасць бытавой электратэхнікі на сумесным прадпрыемстве «Мідэа-Гарызонт», стварэнне Беларуска-Кітайскага індустрыяльнага парка, правядзенне мадэрнізацыі Нацыянальнага аэрапорта «Мінск». У Кітаі былі створаны прадпрыемствы па зборцы, збыце і абслугоўванні беларускіх кар’ерных самазвалаў «БелАЗ», трактароў «Беларус».


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Індустрыяльны парк «Вялікі камень» — асаблівая эканамічная зона, створаная ў адпаведнасці з міжурадавым пагадненнем паміж КНР і Рэспублікай Беларусь

Беларусь актыўна ўдзельнічае ў праекце «Эканамічны пояс Шаўковага шляху». Асаблівую ролю тут адыгрывае Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень» як міжнародны, высокатэхналагічны праект, адкрыты для новых замежных інвестараў. Па стане на студзень 2019 г. у парку зарэгістраваны 42 рэзідэнты з Кітая, Германіі, Канады, Ізраіля і іншых краін.

**Развіццё эканамічных і культурных сувязей з краінамі блізкага і далёкага замежжа.** Развіццё двухбаковых адносін з краінамі СНД — адзін з асноўных знешнепалітычных і знешнеэканамічных прыярытэтаў Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым важнейшай сферай супрацоўніцтва з'яўляецца гандлёва-эканамічнае ўзаемадзеянне. Ключавымі гандлёвымі партнёрамі выступаюць Расія, Украіна, Казахстан, Азербайджан і Малдова, на долю якіх прыпадае больш за 90 % беларускага экспарту ў рэгіён СНД.

Пашырылася супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай і гуманітарнай сферах, па пытаннях міжнароднай бяспекі з краінамі Еўрапейскага саюза і Злучанымі Штатамі Амерыкі.

Рэспубліка Беларусь паслядоўна ўмацоўвае і пашырае далёкую знешнепалітычную «дугу» саюзнікаў і партнёраў у Азіяцкім, Блізкаўсходнім, Афрыканскім і Лацінаамерыканскім рэгіёнах. Асноўныя кірункі развіцця адносін — актывізацыя палітычнага, эканамічнага і культурнага ўзаемадзеяння з традыцыйнымі партнёрамі (Кітай, В'етнам, Індыя, ААЭ, Сірыя, Егіпет), наладжванне дыялогу, актыўны

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Ахарактарызуйце геаграфію знешнепалітычных і знешнеэканамічных сувязей Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.*

выхад і замацаванне на рынках дзяржаў, якія маюць значны патэнцыял для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Вектар развіцця ўзаемаадносін з Лацінскай Амерыкай накіраваны ў першую чаргу на супрацоўніцтва з такімі краінамі, як Куба, Бразілія, Венесуэла.

Сімволіка Беларускага таварыства сяброўства і культурнай сувязі з замежнымі краінамі

Актыўна развіваецца міжнароднае культурнае супрацоўніцтва. Ключавой падзеяй такога супрацоўніцтва стаў штогадовы фестываль «Славянскі базар у Віцебску». Рэгулярна праводзяцца міжнародныя фестывалі мастацтваў, мастацкія выставы, кіна- і тэатральныя фестывалі.

Адным з прыярытэтаў з'яўляецца супрацоўніцтва ў сферы культуры з ЮНЕСКА. Чатыры аб'екты на тэрыторыі Беларусі ўключаны ў Спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Гэта Белавежская пушча, Мірскі замак, Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, Дуга Струвэ, якая праходзіць па тэрыторыі яшчэ дзевяці еўрапейскіх дзяржаў.

Характэрнай рысай міжнародных культурных сувязей Беларусі на сучасным этапе стала пашырэнне ўдзелу ў іх няўрадавых арганізацый. Найбольш уплывовай структурай з'яўляецца Беларускае таварыства сяброўства і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Галоўныя мэты гэтай арганізацыі — папулярызацыя культуры замежных краін у Беларусі і беларускай культуры за мяжой, паглыбленне міжнароднага супрацоўніцтва ў культурных, адукацыйных і гуманітарных праграмах, развіццё народнай дыпламатыі.

*Канкрэтызуйце прыкладамі шматвектарны характар культурнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з краінамі свету.*

**Развіццё сувязей з беларускай дыяспарай.** Па інфармацыі розных крыніц, колькасць беларускай дыяспары ў свеце складае каля 2,5 млн чалавек. Найбольш магутна яна прадстаўлена ў суседніх і гістарычна звязаных з Беларуссю краінах — Расіі, дзяржавах Балтыі, Украіне, Польшчы, Казахстане, Узбекістане, Малдове. Беларуская дыяспара прысутнічае таксама ў краінах далёкага замежжа — Аўстраліі, Аўстрыі, Аргенціне, Вялікабрытаніі, Германіі, Ізраілі, Іспаніі, Італіі, Канадзе, Нідэрландах, ЗША, Польшчы, Японіі і інш.

У 2014 г. набыў моц Закон «Аб беларусах замежжа». Дакументам рэгулюецца парадак аднясення асоб да беларусаў замежжа, а таксама рэгламентуюцца меры


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

дзяржаўнай падтрымкі гэтай катэгорыі грамадзян. У верасні 2014 г. створаны Кансультацыйны савет пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь па справах беларусаў замежжа, удзельнікі якога ўзгадняюць сумесныя крокі па развіцці партнёрства дзяржавы і дыяспары.

1. Ахарактарызуйце асноўныя прынцыпы і кірункі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе.
2. Якія, на ваш погляд, перспектыўныя кірункі эканамічнага, навукова-тэхнічнага, культурнага супрацоўніцтва краін на постсавецкай прасторы?
3. Выкарыстоўваючы тэкст параграфа і дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленне (прэзентацыю) аб дасягненнях знешнепалітычнай дзейнасці суверэннай Рэспублікі Беларусь.
4. Ацаніце месца і ролю Рэспублікі Беларусь у сучасных геапалітычных працэсах на постсавецкай прасторы, у Еўропе, у свеце.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Наш край

Абагульненне па раздзеле III

# Абагульненне па раздзеле «Беларусь у сістэме міжнародных адносін»

## Працуем з вучэбным тэкстам

**1.** Пацвердзіце фактамі з тэксту вучэбнага дапаможніка, што беларуская зямля не аднойчы станавілася арэнай баявых дзеянняў у вырашэнні міжнародных канфліктаў буйных сусветных дзяржаў. Як вы лічыце, якім чынам дадзеныя факты гісторыі адбіліся:

а) на сучаснай знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь;

б) на нацыянальным характары беларускага народа?

**2.** Выкарыстоўваючы тэкст вучэбнага дапаможніка і дадатковыя крыніцы інфармацыі, запоўніце табліцу «Рэспубліка Беларусь у міжнародных арганізацыях і аб'яднаннях». Зрабіце вывад.

| Назва арганізацыі альбо аб'яднання | Асноўныя кірункі дзейнасці | Удзел Рэспублікі Беларусь у дзейнасці арганізацыі |
|---|---|---|
| ААН | | |
| ЮНЕСКА | | |
| СНД | | |
| Мытны саюз | | |
| АДКБ | | |
| Саюзная дзяржава | | |
| АБСЕ | | |

## Працуем з паняццямі

**1.** Растлумачце, як у гісторыі Беларусі ўзаемазвязаны паміж сабой наступныя пары паняццяў: «план Агінскага» і аўтаномія, Заходняя Беларусь і паланізацыя, «новы парадак» і генацыд, Белавежскія пагадненні і Садружнасць Незалежных Дзяржаў.

**2.** Складзіце кластар (ментальную карту) «Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь». У яе змесце адлюструйце асноўныя кірункі і прыклады супрацоўніцтва нашай краіны ў эканамічнай, культурнай і іншых сферах з рознымі дзяржавамі свету.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Сістэматызуем веды

Запоўніце табліцу «Асаблівасці геапалітычнага становішча Беларусі». Зрабіце вывад.

| Фактар геапалітычнага становішча | Перавагі | Недахопы | Уплыў на знешнюю палітыку Рэспублікі Беларусь |
|---|---|---|---|
| Плошча і працягласць меж дзяржавы | | | |
| Геаграфічнае размяшчэнне | | | |
| Выхад да мора, рачныя камунікацыі і г. д. | | | |
| Колькасць і склад насельніцтва | | | |
| Сумеснае гістарычнае мінулае з іншымі народамі | | | |
| Фактары, якія, на ваш погляд, варта дадаць | | | |

## Аналізуем і разважаем

Вызначце правільную паслядоўнасць падзей. Растлумачце прычынна-выніковыя сувязі ў атрыманых ланцужках:

а) Літбел — пачатак польска-савецкай вайны — другое абвяшчэнне ССРБ — стварэнне СССР — Рыжскі мірны дагавор;

б) Брэсцкі мірны дагавор — пачатак Першай сусветнай вайны — абвяшчэнне БНР — тэлеграма Рады БНР германскаму кайзеру;

в) Дэкларацыя аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР — паход Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь — пачатак Другой сусветнай вайны — Народны сход Заходняй Беларусі.

## Падбіраем аргументы

Ці згодныя вы з меркаваннем, што беларусы адстаялі свае права на незалежную нацыянальную дзяржаву?

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Складаем тэзісы

**1.** Азнаёмцеся з фрагментам выступлення кіраўніка дэлегацыі Рэспублікі Беларусь С. М. Мартынава на пасяджэнні Савета НАТА ў лістападзе 2002 г. і складзіце тэзісны план адказу на пытанне: «Пазіцыя беларускай дзяржавы на міжнароднай арэне». Дайце складзенаму плану «гаворачую» назву.

*«Права народа самастойна, без баязлівай аглядкі на „замежнага дзядзьку“, будаваць свой уласны нацыянальны дом і рабіць пры гэтым надзейны ўнёсак у будаўніцтва бяспечнага дома еўрапейскага.*

*...Беларусь ... была ў ліку нямногіх краін, якія забяспечылі сапраўдную, а не галівудскую перамогу над нацызмам, без якой былі б немагчымыя ААН, АБСЕ і НАТА... [Беларусь] першай і без якіх-небудзь умоў адмовілася ад ядзернай спадчыны СССР...*

*...мы штодзень спыняем ідучую на Захад на грэбені эміграцыйнай хвалі беспрэцэдэнтную лавіну наркотыкаў і перарываем сустрэчны паток кантрабанды зброі і ядзерных матэрыялаў для тэрарыстаў...*

*Гэта, па-вашаму, не ўнёсак у бяспеку Еўропы?*

*...Мы страцілі ў мінулай вайне столькі сваіх сыноў і дачок, што гатовыя зрабіць і зробім усё, каб не дапусціць новай трагедыі для свайго і іншых народаў...*

*Партнёраў і саюзнікаў страціць лёгка. Іх цяжка набыць...»*

**2.** Звярніцеся да тэксту Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.

Якія каштоўнасці транслiруе адзін з галоўных сімвалаў нашай дзяржавы? Як геапалітычнае становішча і працэсы, якія мелі месца ў гісторыі, паўплывалі на фарміраванне нацыянальных рыс і каштоўнасцей беларускага народа? Свой адказ пацвердзіце словамі гімна.

## Робім вывады

Ахарактарызуйце геапалітычныя наступствы для Беларусі такіх ваенных канфліктаў:

а) Айчынная вайна 1812 г.;
б) Першая сусветная вайна;
в) польска-савецкая вайна;
г) Вялікая Айчынная вайна.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Творчае заданне

**1.** Уявіце, што ў вас з'явілася магчымасць узяць інтэрв'ю ў аднаго з гістарычных дзеячаў, якія прымалі ўдзел у геапалітычных працэсах XIX–XX стст., напрыклад, М. К. Агінскага, А. Р. Чарвякова, В. З. Каржа, К. В. Кісялёва і інш. Распрацуйце комплекс пытанняў для інтэрв'ю, якія дазволілі б стварыць партрэт асобы ў гісторыі, а таксама больш глыбока вывучыць і зразумець падзеі, непасрэднымі ўдзельнікамі альбо сведкамі якіх яны з'яўляліся. Падумайце, хто яшчэ з гістарычных дзеячаў, звязаных са станаўленнем і абаронай незалежнасці нашай краіны, а таксама яе дзейнасцю на міжнароднай арэне, мог бы вас зацікавіць.

**2.** «Лёс чалавека». Для ўрока па тэме «Наш край» правядзіце даследаванне аб удзеле аднаго з вашых сваякоў альбо блізкіх людзей у геапалітычных падзеях XX ст. на тэрыторыі Беларусі. Падбярыце адпаведныя фотаздымкі, дакументы, зрабіце неабходныя каментарыі да іх.

## Прыкладныя тэмы даследчых і праектных работ

Сімвалы і месцы памяці беларускага народа аб падзеях войнаў і баявых дзеяннях XIX–XX стст.

Этапы і асаблівасці фарміравання знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь.

## Рэкамендуем наведаць музеі

**Мінск**: Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.
Музей сучаснай беларускай дзяржаўнасці (філіял музея).
Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.
Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь».
Мемарыяльны комплекс «Курган Славы Савецкай арміі-вызваліцельніцы».
Гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна».
**Брэст**:
Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой».
**Вілейскі раён**:
Музей Першай сусветнай вайны ў в. Заброддзе.
**Магілёў**:
Мемарыяльны комплекс «Буйніцкае поле».
**Усе рэгіёны**: абласныя і раённыя краязнаўчыя музеі,
музеі баявой і народнай славы.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ